ДЗЯРЖАЎНАЯ НАВУКОВАЯ ЎСТАНОВА
«ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ
НАВУК БЕЛАРУСІ»

Аб’ект аўтарскага права

УДК [94+347.645-058.862:316.343](476-89)“1772/1861”

ПЫШКАЛА
Кацярына Рыгораўна

# САСЛОЎНАЯ АПЕКА НАД ДЗЕЦЬМІ-СІРОТАМІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1772–1861 ГГ.)

**Аўтарэферат
дысертацыі на саісканне вучонай ступені
кандыдата гістарычных навук
па спецыяльнасці 07.00.02 – айчынная гісторыя**

Мінск, 2026

Работа выканана ў дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»

| | |
|---|---|
| Навуковы кіраўнік | **Анофранка Наталля Васільеўна,**<br>кандыдат гістарычных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела гісторыі Беларусі канца XVIII – пачатку XX стагоддзяў дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| Афіцыйныя апаненты: | **Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч**,<br>доктар гістарычных навук, дацэнт, галоўны навуковы супрацоўнік аддзела навейшай гісторыі Беларусі дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі»<br><br>**Яноўскі Алег Антонавіч**,<br>кандыдат гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры гісторыі Расіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| Апаніруючая арганізацыя | Установа адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» |

Абарона адбудзецца 11 сакавіка 2026 г. у 14.00 на пасяджэнні Савета па абароне дысертацый Д 01.40.01 на саісканне ступені доктара гістарычных навук пры дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, г. Мінск, вул. Акадэмічная, 1; тэлефон вучонага сакратара: 8 (017) 387-85-19; e-mail: lakvadim@yandex.ru

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў дзяржаўнай установе «Цэнтральная навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» па адрасе: 220072, Мінск, вул. Сурганава, 15.

Аўтарэферат разасланы 6 лютага 2026 г.

Вучоны сакратар
Савета па абароне дысертацый Л. Лакіза

# УВОДЗІНЫ

Апека над сіротамі – гэта сукупнасць інстытутаў, практык, ініцыятыў, якія ажыццяўляюць абарону правоў і інтарэсаў сірот і спрыяюць іх інтэграцыі ў грамадства. У працэсе гістарычнага развіцця апека эвалюцыянавала ад архаічных форм, звязаных з сямейна-родавымі звычаямі і хрысціянскімі прынцыпамі міласэрнасці, да аформленых дзяржаўных структур, накіраваных на дапамогу і падтрымку дзяцей, якія засталіся без бацькоў. У XVIII–XIX стст. беднасць, голад, масавыя эпідэміі (тыф, чума, халера і інш.) былі неад’емнымі ўмовамі жыцця і прыводзілі да пастаяннай вялікай колькасці сірот. Сіроты без кантролю і інтэграцыі ў грамадства ўяўляюць пагрозу для бяспекі супольнасці і дзяржавы па прычыне іх схільнасці да крымінальных спосабаў выжывання. Таму ўсталяванне апекі было накіравана на захаванне жыцця і здароўя непаўналетніх дзяцей, іх адаптацыю да норм соцыуму.

Падчас знаходжання тэрыторыі Беларусі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай праблема апекі над сіротамі вырашалася на аснове звычаёвага права, заснаванага на абшчынных традыцыях. У XVI ст. спробы абараніць інтарэсы сірот шляхецкага паходжання з боку дзяржавы знайшлі адлюстраванне ў Статутах ВКЛ. Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай на землі былога ВКЛ распаўсюдзіліся падыходы да апекі над дзецьмі-сіротамі, уласцівыя Расійскай імперыі. Насельніцтва імперыі падзялялася на саслоўі дваранства, духавенства, гарадскіх і сельскіх абывацеляў, у адпаведнасці з чым апека набыла саслоўны характар. Складванне практык абароны правоў сірот было працяглым працэсам і мала залежала ад палітычных падзей і змены кіравання імператараў на працягу канца XVIII – першай паловы XIX ст. У саслоўях дваран і гарадскіх абывацеляў, прадстаўнікі якіх валодалі істотнай маёмасцю, былі створаны адпаведныя інстытуты (установы) апекі. У гэтым выпадку апека была абумоўлена неабходнасцю абароны маёмасці сірот, атрыманай у спадчыну ад памерлых бацькоў. Практычная дзейнасць інстытутаў апекі – дваранскіх апек і сіроцкіх судоў – адпавядала прававым нормам. Пра іх эфектыўнасць сведчыў працяглы перыяд існавання (145 гадоў) без істотных змен у структуры і функцыях.

У саслоўях духавенства і сельскіх абывацеляў, якія валодалі маёмасцю ў нязначным памеры, апека ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. паступова сістэматызавалася, аднак без фарміравання адпаведных інстытутаў. У духоўным саслоўі клопат аб сіротах адбываўся на падставе карпаратыўных правілаў. Сярод сельскіх абывацеляў апека дыферэнцыявалася ў залежнасці ад катэгорыі сялян (удзельныя, дзяржаўныя, прыватнаўласніцкія), выражалася ў розных падыходах дзяржавы да ўрэгулявання праблемы ў гэтых сацыяльных групах. Большасць сельскіх абывацеляў на тэрыторыі Беларусі складалі прыватнаўласніцкія сяляне. Апека над сіротамі прыгонных сялян абапіралася на сямейна-абшчынныя традыцыі

і памешчыцкі патэрналізм пры мінімальным кантролі дзяржавы. Дзеці-сіроты саслоўя сельскіх абывацеляў часцей за іншыя саслоўі станавіліся ахвярай абставін, нярэдка рабіліся злачынцамі.

Навуковая актуальнасць даследавання заключаецца ў тым, што рэтраспектыўны аналіз саслоўнай апекі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. дае магчымасць ацаніць становішча дзяржаўнай падтрымкі дзяцей-сірот і ўзровень яе сістэмнасці. Акрамя гэтага, апека над сіротамі можа разглядацца як індыкатар культурна-этычнага і гуманістычнага ўзроўню грамадства, а таксама як паказчык сацыяльна-прававога і эканамічнага развіцця дзяржавы.

Палітыка Рэспублікі Беларусь накіравана на абарону правоў дзяцей-сірот і забеспячэнне іх інтарэсаў пры дапамозе сістэмы дзяржаўнай падтрымкі. У аснову дзейнасці органаў улады пакладзены закон ад 21 снежня 2005 г. «Аб гарантыях па сацыяльнай абароне дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, а таксама асоб з ліку дзяцей-сірот і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў» (на працягу 2007–2024 гг. у яго ўносіліся змены і дадаткі). Нягледзячы на значныя намаганні дзяржавы, праблема сіроцтва носіць пастаянны характар. Па стане на 2025 г. у Беларусі налічваецца каля 15,5 тысяч дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Таму вывучэнне пытання апекі над сіротамі ў мінулым, разнастайных практык і падыходаў да вырашэння гэтай праблемы можа паспрыяць больш комплекснаму яе асэнсаванню ў сучаснасці.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

### Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі і тэмамі

Дысертацыйнае даследаванне падрыхтавана ў рамках дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Грамадства і гуманітарная бяспека беларускай дзяржавы» (тэрмін выканання 2021–2025 гг.), у падпраграме 1 «Гісторыя», зацверджанай Пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь № 438 ад 27.07.2020.

Тэма дысертацыйнага даследавання «Інстытуты саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях Расійскай імперыі (1772–1860 гг.)» была зацверджана на пасяджэнні Вучонага савета дзяржаўнай навуковай установы «Інстытут гісторыі НАН Беларусі» (пратакол № 13 ад 27 снежня 2022 г.). Тэма дысертацыі ўдакладнена на пасяджэнні Савета Д 01.40.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені доктара гістарычных навук пры дзяржаўнай навуковай установе «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» ў наступнай рэдакцыі: «Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)» (пратакол № 1 ад 27 студзеня 2026 г.).

**Мэта і задачы даследавання.** *Мэта* даследавання – выяўленне прававых асноў, форм і асаблівасцей саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Для яе вырашэння пастаўлены наступныя *задачы*:

1) паказаць эвалюцыю юрыдычнага забеспячэння станаўлення саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;

2) раскрыць спецыфіку арганізацыі і практыкі апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;

3) вызначыць характэрныя рысы ў саслоўнай апецы над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;

4) паказаць адметныя рысы ў практыцы апекі над сіротамі духоўнага саслоўя на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.;

5) выявіць асаблівасці ажыццяўлення апекі ў дачыненні да сірот саслоўя сельскіх абывацеляў на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

**Аб'ект даследавання** – сацыяльны і прававы стан грамадства Беларусі ў 1772–1861 гг.

**Прадмет даследавання** – саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

*Геаграфічныя межы* даследавання ахопліваюць тэрыторыю сучаснай Беларусі, якая ўваходзіла ў склад Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай губерняў. Пры гэтым спецыфіка грамадскага жыцця канца XVIII – першай паловы XIX ст. (мабільнасць гарадскога насельніцтва, уцёкі сялян ад памешчыкаў, праблема дзіцячага бадзяжніцтва і жабрацтва) абумовіла ў некаторых выпадках выхад за геаграфічныя межы даследавання.

*Ніжняй храналагічнай мяжой* даследавання вызначаны 1772 г. – першы падзел Рэчы Паспалітай, калі ўсходнія тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага былі ўключаны ў склад Расійскай імперыі. *Верхняя храналагічная мяжа* пазначана 1861 г. – адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі, якая выклікала кардынальную змену структуры грамадства.

**Навуковая навізна даследавання.** Дадзеная работа з'яўляецца першым у айчыннай гістарыяграфіі даследаваннем гісторыі саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў Беларусі ў 1772–1861 гг. На падставе шырокага кола крыніц, якія ўпершыню ўведзены ў навуковы ўжытак, паказаны прававыя асновы, раскрыты формы, асаблівасці і эвалюцыя станаўлення і развіцця саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Былі вызначаны формы, адлюстраваны прынцыпы арганізацыі і асаблівасці абароны інтарэсаў і маёмасных правоў дзяцей-сірот дваранскага саслоўя; раскрыта роля дваранскіх апек і сіроцкіх судоў як саслоўных інстытутаў апекі ў дачыненні да дваранства і гарадскіх абывацеляў. Упершыню ў гістарыяграфіі выяўлены і ахарактарызаваны этапы станаўлення і развіцця сістэмы апекі над дзецьмі-сіротамі ў саслоўі духавенства, вызначаны формы апекі над сіротамі сельскіх абывацеляў, разгледжаны і адзначаны

іх асаблівасці, абумоўленыя шэрагам тых гістарычных фактараў, якія аказвалі ўплыў на працэс сацыяльнага развіцця грамадства Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону:**

1. Юрыдычнае забеспячэнне станаўлення і дзейнасці апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. характарызавалася паслядоўнасцю і паступовай эвалюцыяй. Агульнага для ўсіх саслоўяў заканадаўства аб апецы над сіротамі не існавала. З 1775 г. апека над сіротамі дваран і гарадскіх абывацеляў па ініцыятыве дзяржаўнай улады набыла форму саслоўных інстытутаў – дваранскіх апек і сіроцкіх судоў. Заканадаўчыя практыкі базіраваліся на выкарыстанні норм дзвюх крыніц права: расійскіх законаў (асобныя ўказы і «Свод законов Российской империи») і Статута ВКЛ 1588 г. (да 1835 г.). Апека над дзецьмі-сіротамі духоўнага саслоўя па сіле дактрынальных правіл і канфесійнай палітыкі рэгламентавалася прававымі нормамі толькі для праваслаўнага і ўніяцкага духавенства, знаходзілася ў кампетэнцыі царкоўных структур пры мінімальным умяшальніцтве дзяржаўнай улады. Праваое афармленне апекі над сіротамі сельскіх абывацеляў адбывалася толькі ў дачыненні да ўдзельных і дзяржаўных сялян. У адносінах да дзяцей-сірот прыватнаўласніцкіх сялян заканадаўчых норм аб апецы распрацавана не было.

2. Інстытуцыяналізацыя абароны правоў сірот дваранскага саслоўя пачалася з заснавання дваранскіх апек у 1775 г. На тэрыторыі Беларусі спецыфіка гэтага працэсу заключалася 1) у частковым выкарыстанні норм Статута ВКЛ 1588 г. у канцы XVIII – пачатку XIX ст. у дзейнасці гэтых установ; 2) у асінхронным заснаванні дваранскіх апек у розных частках Беларусі; 3) у асаблівасцях вядзення спраў сірот, якія не пацвердзілі сваё дваранскае паходжанне. Працэс апекі ўключаў наступныя працэдуры: узяцце сірот пад нагляд, прызначэнне апекуноў, вопіс маёмасці памерлых, кантроль апекуноў. У практычнай дзейнасці дваранскіх апек на першы план выходзілі кіраванне маёмасцю і яе захаванне, а не клопат аб асобе дзіцяці. Да паўналецця дваранскіх сірот забяспечвалі апекуны, выкарыстоўваючы даходы ад маёмасці, працэнты ад укладаў і ўласныя сродкі. Дваранскія дзеці-сіроты ў залежнасці ад узросту, полу, матэрыяльнай забяспечанасці, здароўя маглі атрымаць хатняе або пазахатняе выхаванне і адукацыю з мэтай іх інтэграцыі ў грамадства.

3. Саслоўнымі інстытутамі апекі над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў з 1775 г. выступалі сіроцкія суды. Вылучаны характэрныя рысы дзейнасці гэтых установ у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, абумоўленыя рознымі фактарамі: 1) на працягу канца XVIII – пачатку XIX ст. у іх працы прымяняліся нормы Статута ВКЛ 1588 г.; 2) сіроцкія суды не прыцягваліся да працы прытулкаў і багадзелень; 3) апекавалі, акрамя розных катэгорый гарадскіх абывацеляў і асабістых дваран, дадаткова аднадворцаў, якія жылі ў гарадах;

4) справаводства сіроцкіх судоў адлюстроўвала этнаканфесійную спецыфіку – перавагу спраў сірот-яўрэяў. Паслядоўнасць дзеянняў сіроцкіх судоў, правілы і прынцыпы вядзення апекі былі падобныя да дваранскіх апек. У адрозненне ад дваран, сіроты гарадскіх абывацеляў з мэтай інтэграцыі ў грамадства пры неабходнасці пераймалі справу бацькоў і засвойвалі адпаведную прафесію. Сірот без маёмасці і сваякоў уладкоўвалі на навучанне да рамеснікаў, а тых, хто не меў апекуноў – на выхаванне да гараджан, якія давалі на гэта згоду.

4. Адметнымі рысамі апекі над сіротамі духоўнага саслоўя былі яе развіццё ў рэчышчы карпаратыўнай адказнасці і існаванне пры мінімальным удзеле дзяржавы. У працэсе арганізацыі апекі над дзецьмі-сіротамі духавенства праваслаўнай канфесіі можна вылучыць два этапы. На першым этапе (1799–1822 гг.) апеку накладала кансісторыя. Галоўнай формай падтрымкі былі грашовыя выплаты за кошт даходаў царквы і магнацкай дабрачыннасці, памер якіх залежаў ад ступені патрэбы сірот у дадатковай дапамозе. На другім этапе (1823–1861 гг.) развіцця апекі над сіротамі дзейнічалі епархіяльныя папячыцельствы аб бедных духоўнага звання, якія размяркоўвалі фінансавую дапамогу асобным прадстаўнікам духоўнага саслоўя. Замкнёнасць духоўнага саслоўя абумовіла асаблівасці выхавання дзяцей-сірот: 1) апекунамі ў асноўным былі духоўныя асобы; 2) хлопчыкі-сіроты навучаліся ў семінарыях; 3) дзяўчынкі або выхоўваліся апекунамі-святарамі, або ў манастырах. Ва ўніяцкай канфесіі апека над сіротамі мела падабенства з практыкамі праваслаўнага духавенства, але без адпаведнай структуры.

5. Асаблівасці ажыццяўлення апекі сірот саслоўя сельскіх абывацеляў заключаліся ў яе неаднароднасці ў дачыненні да розных катэгорый сялян. Да апекі над сіротамі ўдзельных і дзяржаўных сялян прымяняліся зафіксаваныя ў заканадаўстве падыходы. Адказнасць за лёс дзяцей-сірот прыватнаўласніцкіх сялян, якія складалі большасць у Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях, але не валодалі прыватнай уласнасцю і былі абмежаваны ў асабістых правах, неслі памешчыкі і сялянская абшчына. Некаторую дапамогу сіротам гэтага саслоўя аказвалі прыказы грамадскай апекі і праваслаўная царква. Дыферэнцыяванасць і малаэфектыўнасць апекі прыводзілі да таго, што сіроты нярэдка пакідалі абшчыну, сыходзілі ад памешчыкаў, станавіліся жабракамі і бадзягамі.

**Асабісты ўклад саіскальніка.** Даследаванне з'яўляецца вынікам самастойнай працы аўтара. Пры падрыхтоўцы дысертацыі быў выяўлены, апрацаваны і прааналізаваны вялікі масіў дакументальных крыніц, большая частка з якіх упершыню ўведзена ў навуковы ўжытак. Усе навуковыя публікацыі падрыхтаваны саіскальнікам асабіста. Навуковыя палажэнні і высновы дысертацыі распрацаваны аўтарам самастойна і прайшлі апрабацыю на 14 міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў.** Асноўныя палажэнні дысертацыі прайшлі апрабацыю на VI Міжнароднай навуковай канферэнцыі «“Долгий XIX век” в истории Беларуси и Восточной Европы» (г. Мінск, 23–24 сакавіка 2023 г.); VI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў «Ars Longa: научные достижения и перспективы» (г. Мінск, 27–28 красавіка 2023 г.), навукова-практычнай канферэнцыі «Архівы і архівісты Беларусі: рух па шляху развіцця» (г. Мінск, 4 ліпеня 2023 г.); рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: актуальныя праблемы і задачы» (г. Мінск, 21 верасня 2023 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Пичетовские чтения – 2023: «Институциональные изменения в гуманитарной сфере как отражение политических и экономических процессов (к 80-летию возобновления работы БГУ на ст. Сходня и 145-летию со дня рождения В. И. Пичеты)» (г. Мінск, 11 кастрычніка 2023 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.» (г. Мінск, 17 лістапада 2023 г.); XV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых вучоных і спецыялістаў «Библиотека в XXI веке: деятельность, инициативы и результаты» (г. Мінск, 20 лютага 2024 г.); навукова-практычнай канферэнцыі «IV Чтения памяти протоиерея Иоанна Григоровича (1792–1852): историка, археографа, археолога» (г. Мінск, 11 красавіка 2024 г.); круглым стале «Актуальныя пытанні гісторыі Беларусі канца XVIII–пачатку XX ст.», прысвечаным 75-годдзю Валянціны Васільеўны Яноўскай (г. Мінск, 30 мая 2024 г.); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі (да 525-годдзя атрымання горадам магдэбургскага права)» (г. Мінск, 6 верасня 2024 г.); Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: актуальныя праблемы і задачы» (г. Мінск, 19 верасня 2024 г.); V Міжнародным кангрэсе гісторыкаў Беларусі «Гістарычная навука Беларусі: асобы, канцэпцыі, дасягненні (да 95-годдзя Інстытута гісторыі НАН Беларусі)» (г. Мінск, 15–16 кастрычніка 2024 г.); VIII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі маладых даследчыкаў Інстытута гісторыі НАН Беларусі «Ars Longa: научные достижения и перспективы» (г. Мінск, 10–11 красавіка 2025 г.); VII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «“Долгий XIX век” в истории Беларуси и Восточной Европы» (г. Мінск, 22 мая 2025 г.).

Вынікі дысертацыйнага даследавання выкарыстоўваюцца ў практычнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі», акт укаранення ад 19.12.2025 № 1.

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі.** Асноўныя палажэнні і вынікі дысертацыйнага даследавання прадстаўлены ў 13 публікацыях, сярод якіх 4 артыкулы ў навуковых часопісах і зборніках, рэкамендаваных ВАК Рэспублікі Беларусь (агульны абъём – 3,6 друк. арк.), 9 – у іншых навуковых зборніках і

матэрыялах канферэнцый (4,6 друк. арк.). Агульны аб'ём апублікаваных прац складае 8,2 друк. арк.

**Структура і аб'ём дысертацыі.** Мэта і задачы дысертацыі вызначылі яе ўнутраную структуру. Дысертацыйнае даследаванне складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, пяці глаў, заключэння, бібліяграфічнага спіса і трох дадаткаў. Агульны аб'ём дысертацыі складае 151 старонку, тэкст дысертацыі – 114 старонак. Бібліяграфічны спіс дысертацыйнага даследавання ўтрымлівае 324 пазіцыі, з якіх 13 – публікацыі аўтара (разам 29 старонак).

## АСНОЎНАЯ ЧАСТКА

У першай главе **«Гістарыяграфія, крыніцы і метадалогія даследавання»** паказана ступень распрацаванасці праблемы і сфармулявана канцэпцыя, ахарактыразавана база крыніц і пададзена метадалогія.

*У раздзеле 1.1 «Гістарыяграфія»* праведзены аналіз тэматычных накірункаў, якія знайшлі адлюстраванне ў даследаваннях канца XIX – пачатку XXI ст.: заканадаўства, дваранскія апекі, сіроцкія суды, апека над сіротамі сельскіх абывацеляў і сумежныя пытанні.

У дарэвалюцыйнай расійскай гістарыяграфіі даследчыкі эпізадычна звярталіся да тэмы дваранскіх апек і сіроцкіх судоў, засяроджваліся на прававых аспектах[1]. Сучасныя расійскія гісторыкі ўзнімалі праблему саслоўнай апекі ў некалькіх накірунках. Першым з'яўляўся заканадаўчы, пры гэтым асноўная ўвага канцэнтравалася на другой палове XIX ст., калі заканадаўства было ўніфікавана[2]. Праблемы перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. былі даследаваны расійскімі гісторыкамі і правазнаўцамі толькі фрагментарна[3]. Другім накірункам даследаванняў расійскай гістарыяграфіі з'яўляецца апісанне практычнай дзейнасці саслоўных інстытутаў апекі, у першую чаргу дваранскай апекі ў розных губернях Расійскай імперыі[4]. Працам характэрна пэўная геаграфічная абмежаванасць.

---

[1] Анучин, Е. Н. Исторический обзор развития административно-полицейских учреждений в России, с Учреждения о губерниях 1775 г. до последнего времени : составлен по распоряжению министра внутренних дел чиновником особых поручений при министре Е. Анучиным / Е. Н. Анучин. – СПб. : Тип. М-ва внутр. дел, 1872. – 238 с.; Григорьев, В. А. Реформа местного управления при Екатерине II : (Учреждение о губерниях 7 нояб. 1775 г.) / В. А. Григорьев. – СПб. : Рус. скоропеч., 1910. – 387 с.; Романович-Славатинский, А. В. Дворянство в России от начала XVIII века до отмены крепостного права / А. В. Романович-Славатинский. – СПб. : Тип. М-ва внутр. дел, 1870. – 594 с.; Яблочков, М. Т. История дворянского сословия в России / М. Т. Яблочков. — СПб. : Тип. А. М. Котомина, 1876. – 680 с.

[2] Дашин, А. В. Особенности осуществления опеки по законодательству Российской империи / А. В. Дашин // Проблемы развития предприятий: теория и практика. – 2023. – № 1–3. – С. 122–125.

[3] Думенко, О. Е. Сиротские суды в законодательстве Российской империи / О. Е. Думенко // Вестник Тверского государственного университета. Серия: История. – 2010. – № 3. – С. 106–115; Сагалаева, Е. С. История формирования правового института опеки над несовершеннолетними / Е. С. Сагалаева, С. Н. Ивахненко, О. В. Ландина // Закон и право. – 2019. – № 10. – С. 44–48.

[4] Кормчина, Е. С. Институт дворянской опеки в Рязанской губернии в конце XVIII – первой половине XIX века / Е. С. Кормчина // Труды Исторического факультета Санкт-Петербургского университета. – 2012. – № 9. – С. 7–13; Васильева, И. В. Деятельность дворянских опек в Казанской и Симбирской губерниях в XVIII веке / И. В. Васильева // Вестник Чувашского государственного университета. – 2007. – № 1. – С. 3–10; Рубанова, И. В. Отражение дворянского общества XIX века: Глазовская дворянская опека / И. В. Рубанова // Материальная и духовная культура народов Урала и Поволжья: история и современность. История севера Удмуртии в XVI–XX вв. : материалы Междунар. науч.-практ. конф. / М-во нац политики Удмурт. Респ., Федер. агенство по образованию, Глазов. гос. пед. ин-т им. В. Г. Короленко ;

Даследчыкі не праяўлялі інтарэсу да дзейнасці дваранскіх апек у заходніх губернях (тэрыторыях, далучаных у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай). Расійская гістарыяграфія гісторыі дваранскіх апек больш засяроджана на другой палове XIX ст.[5] Былі таксама апублікаваны абагульняючыя працы[6]. Аўтары разглядалі дваранскія апекі з пункту гледжання адпаведнасці практыкі прапісаным законам, а таксама з пункту гледжання дабрачыннасці.

Праблема апекі над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў у расійскай гістарыяграфіі звязана з дзейнасцю сіроцкіх судоў, пераважна ў перыяд другой паловы XIX – пачатку XX ст.[7] Дзейнасць сіроцкіх судоў у канцы XVIII – першай паловы XIX ст. прадстаўлены ў нешматлікіх, пераважна рэгіянальных даследаваннях[8]. У некаторых публікацыях расійскіх навукоўцаў сіроцкі суд

---

редкол. Г. А. Поздеев (гл. ред.) [и др.]. – Глазов, 2008. – С. 31–40; Аксёнова, М. Д. Работа Дворянской уездной опеки Московского уезда в первой половине XIX века / М. Д. Аксёнова // Чертковский исторический сборник / Гос. публ. ист. б-ка России ; редкол. М. Д. Афанасьев, А. В. Сазанов (отв. ред.) [и др.]. – М., 2019. – Вып. 2 : Российская империя во времени и пространстве. – С. 187–201; Першин, С. В. Опека над дворянскими поместьями в Пензенской губернии в первой половине XIX в. / С. В. Першин, Т. А. Першина, С. К. Мкоян // Экономическая история. – 2016. – № 3 (34). – С. 53–62; Першин, С. В. Сословные учреждения в России в первой половине XIX века (по материалам дворянских и городских обществ средневолжских губерний) : автореф. дис. ... д-ра ист. наук : 07.00.02 / Першин Сергей Викторович ; Мордов. гос. ун-т им. Н. П. Огарева. – Саранск, 2010. – 51 с.; Першин, С. В. Сословные учреждения в России в первой половине XIX века (по материалам дворянских и городских обществ средневолжских губерний) / С. В. Першин. – Саранск: Издат. центр Ист.-социол. ин-та Мордов. гос. ун-та, 2010. – 316 с.; Литвинова, Т. Н. Организация и деятельность дворянских сословных учреждений Воронежской губернии последней четверти XVIII – первой половины XIX вв.: автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Литвинова Татьяна Николаевна ; Воронеж. гос. ун-т. – Воронеж, 2005. – 24 с.

[5] Цветков, В. С. Организация деятельности дворянской опеки во второй половине XIX – начале XX вв. (на примере Московской губернии) / В. С. Цветков // Вестник Московского государственного областного университета. Серия: История и политические науки. – 2012. – № 2. – С. 91–96; Вьюнник, Е. П. Процедура и практика установления и снятия опеки в пореформенный период для несовершеннолетних дворян, оставшихся без попечения родителей (на материалах Курской губернии) / Е. П. Вьюнник // Научные ведомости Белгородского государственного университета. Серия: Экономика. Информатика. – 2011. – № 13 (108). – С. 119–125; Соловьева, Е. А. Система призрения дворянских детей-сирот во второй половине XIX в. (на материалах Симбирской губернии) / Е. А. Соловьева // Международный научно-исследовательский журнал. – 2016. – № 8 (50). – С. 158–160; Соловьева, Е. А. Практика установления и снятия опеки над личностью и имуществом дворян-сирот во второй половине XIX в. (на материалах Симбирской губернии) / Е. А. Соловьева // Исторические, философские, политические и юридические науки, культурология и искусствоведение. Вопросы теории и практики. – 2014. – № 8–1 (46). – С. 155–157; Федосеев, Р. В. Деятельность дворянских опек в губерниях Среднего Поволжья во второй половине XIX в / Р. В. Федосеев // Теория и практика общественного развития. – 2014. – № 19. – С. 122–125.

[6] Дунаева, С. Л. Установление дворянской опеки над несовершеннолетними детьми в Российской империи во второй половине XIX – начале XX в. / С. Л. Дунаева // Столица и провинции: взаимоотношения центра и регионов в истории России : материалы Всерос. науч. конф. с междунар. участием, Санкт-Петербург, 29 апр. 2016 г. / Ленинград. гос. ун-т им. А. С. Пушкина ; редкол. В. В. Карпова (отв. ред) [и др.]. – СПб., 2016. – Вып. 7. – С. 37–40; Шахов, В. В. Благотворительная деятельность представителей дворянского сословия России во второй половине XVIII – начале XX вв.: на материалах Центрального Черноземья : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Шахов Вячеслав Вячеславович ; Белгород. гос. ун-т. – Курск, 2008. – 26 с.; Чернова, М. А. Дворянская опека: в законодательстве и реальной практике / М. А. Чернова // Культурный ландшафт регионов. – 2024. – Т. 6, № 1. – С. 39–50.

[7] Балдин, К. Е. Деятельность Владимирского сиротского суда по опеке несовершеннолетних (2-я пол. XIX в.) / К. Е. Балдин // История государства и права. – 2019. – № 5. – С. 52–58; Паршина, Н. В. Екатеринодарский городской сиротский суд: предпосылки образования и правоприменительная практика по установлению опеки и попечительства над несовершеннолетними (конец XIX – начало XX в.) / Н. В. Паршина // Государство и право. – 2024. – № 8. – С. 190–200; Шестопалова, Д. С. Ключевые проблемы деятельности Симферопольского городского сиротского суда в начале XX века / Д. С. Шестопалова // Потемкинские чтения : сб. ст. по материалам VI Всерос. с междунар. участием науч. конф., Севастополь, 17–19 нояб. 2022 г. / Севастопол. гос. ун-т ; редкол. Г. В. Косов [и др.]. – Севастополь, 2022. – Т. 2. – С. 53–55; Тимофеева, О. А. Порядок оформления опеки в сиротских судах Тобольской губернии (по документам государственного архива Тюменской области) / О. А. Тимофеева // Архивы Урала. – 2021. – № 25. – С. 362–367.

[8] Щербич, С. Н. Делопроизводство в сиротских судах Тобольской губернии / С. Н. Щербич, О. А. Тимофеева, Э. Р. Карпова // Вестник Томского государственного университета. Серия: История. – 2021. – № 73. – С. 67–75; Киприянова, Н. В. Деятельность сиротского суда г. Владимира в конце XVIII – первой половине XIX в / Н. В. Киприянова // Вестник Московского государственного областного университета. Серия: История и политические науки. – 2010. – № 1. – С. 32–41; Короткова, Ю. А. Социальная деятельность судебных учреждений России в 18 веке (сиротские суды Владимирской губернии) / Ю. А. Короткова // Пробелы в российском законодательстве. – 2014. – № 3. –

разглядаецца як частка судовай сістэмы Расійскай імперыі наогул[9]. Найбольш поўна і паслядоўна гэтая праблема пададзена В. Я. Думенка[10].

Праблема апекі над дзецьмі-сіротамі сялянскага паходжання ў расійскай гістарыяграфіі распрацавана фрагментарна. Большасць публікацый гісторыкаў па гэтым пытанні датычыцца перыяду другой паловы XIX – пачатку XX ст., калі апекай над сялянамі займаліся валасныя ўправы і, адпаведна, вялося адмысловае справаводства[11]. Антраполагі і этнолагі разглядалі праблему сіроцтва ў сялянскім асяроддзі на аснове фальклорных і этнаграфічных матэрыялаў[12]. Перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. непасрэдна прысвечаны толькі адзін артыкул А. У. Грыгор’ева (2011 г.), у якім практыкі апекі над сіротамі разглядаліся на прыкладзе ўдзельнай абшчыны ў Сімбірскай губерні[13].

Украінскія вучоныя разглядалі дваранскія апекі і сіроцкія суды, пераважна ў рэгіянальным рэчышчы. Даследаваліся асноўныя накірункі працы і функцыі

С. 59–62; Терюшкова, Л. А. Деятельность сиротского суда на примере опеки над имением олонецкого купца Луки Редуева (1834–1861 гг.) / Л. А. Терюшкова // Научно-исследовательская работа обучающихся и молодых учёных : материалы 74-й Всерос. (с междунар. участием) науч. конф. обучающихся и молодых учёных, Петрозаводск, 04–24 апр. 2022 г. / Петрозавод. гос. ун-т ; редкол. А. А. Малышко (отв. ред.), В. С. Сюнёв (науч. ред) [и др.]. – Петрозаводск, 2022. – С. 414–416; Зуева, Е. А. Опека и попечительство у сибирского купечества в последней четверти XVIII – первой половины XIX в. / Е. А. Зуева // Социально-культурное развитие Сибири: Бахрушинские чтения 1991 г. – Новосибирск, 1991. – С. 25–34; Афонина, Е. В. Участие представителей купеческого сословия в работе сиротского суда г. Свияжска Казанской губернии / Е. В. Афонина // Социокультурная среда российской провинции в прошлом и настоящем : сб. науч. ст. / Елабуж. ин-т Казан. федер. ун-та; редкол. Е. Е. Мерзон [и др.]. – Елабуга, 2015. – С. 37–39; Батиев, Л. В. Формирование и основные направления деятельности сиротского суда армянской колонии Нахичевань-на-Дону в первой половине XIX в. / Л. В. Батиев // Вестник Нижегородского университета им. Н.И. Лобачевского. – 2020. – № 5. – С. 9–16.

[9] Томсинов, В. А. Судебная система Российской империи в XVIII – первой половине XIX в. (по материалам законодательных актов). Статья первая / В. А. Томсинов // Вестник Московского университета. Серия 11, Право. – 2016. – № 3. – С. 3–24; Рарыцкая, А. А. Институт сиротских судов в Российской империи (1775–1917 гг.) / А. А. Рарыцкая // Молодой ученый. – 2024. – № 5 (504). – С. 310–312.

[10] Думенко, О. Е. Сиротские суды Тверской губернии в последней четверти XVIII – первой половине XIX века : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Думенко Ольга Евгеньевна ; С.-Петербург. гос. ун-т. – СПб, 2010. – 22 с.; Думенко, О. Е. Торговый капитал осиротевших горожан (по материалам Тверского сиротского суда последней четверти XVIII – начала XIX в.) / О. Е. Думенко // Торговля, купечество и таможенное дело в России в XVI–XIX вв. : сб. материалов Второй междунар. науч. конф., Курск, 22–23 апр. 2009 г. / Курск. гос. ун-т, Крым. федер. ун-т им. В. И. Вернадского, Рос. нац. б-ка, Ин-т рос. истории Рос. акад. наук ; редкол. Н. Д. Борщик, А. И. Раздорский [и др.]. – Курск, 2009. – С. 209–212; Думенко, О. Е. Документы сиротских судов в справочниках региональных государственных архивов / О. Е. Думенко // Отечественные архивы. – 2012. – № 3. – С. 30–34.

[11] Безгин, В. Б. Опека малолетних и сирот в русском селе (вторая половина XIX века) / В. Б. Безгин // Юридический мир. – 2009. – № 2. – С. 76–80; Плаксина, Е. А. Корыстная подоплека в действиях членов сельского схода по отношению к имуществу крестьянских сирот в начале XX в. (конфликт в дер. Мильтюшской Бердской волости Барнаульского уезда Томской губ.) / Е. А. Плаксина // МНСК-2020: История : материалы 58-й Междунар. науч. студенч. конф., Новосибирск, 10–13 апр. 2020 г. / Новосиб. нац. исслед. гос. ун-т ; редкол. Н. Н. Родигина, Н. С. Гурьянова (гл. ред.) [и др.]. – Новосибирск, 2020. – С. 86–87; Даньшина, А. А. Общественное призрение детей в северо-западной крестьянской общине во второй половине XIX – начале XX вв. (на примере Псковской и Новгородской губерний) / А. А. Даньшина // Вестник Екатерининского института. – 2017. – № 3(39). – С. 35–40; Гордеева, М. А. Правовое положение крестьянских детей-сирот в Томской губернии в конце XIX –начале XX века: формальные правила и их воплощение / М. А. Гордеева // Исторический курьер. – 2021. – № 1 (15). – С. 96–104; Сыромятникова, Н. В. Социальные функции крестьянской общины в середине XIX – начале XX вв. / Н. В. Сыромятникова // Вопросы гуманитарных наук. – 2008. – № 1 (34). – С. 31–33; Соловьева, И. В. Традиции опеки у русских крестьян в конце XIX в. / И. В. Соловьева // Вестник православного Свято-Тихоновского гуманитарного университета. Серия 2, История. История Русской Православной Церкви. – 2011. – Вып. 4 (41). – С. 53–59; Заколодная, В. Н. Организация и функционирование крестьянской опеки над сиротами в России во второй половине XIX – начале XX в / В. Н. Заколодная // Вестник Ленинградского государственного университета им. А. С. Пушкина. – 2010. – Т. 4, № 1. – С. 129–136.

[12] Петров, Н. Сколотки, Богданы и любоделанные: сироты в русской деревне / Н. Петров // Arzamas.academy. – URL: https://arzamas.academy/materials/1682 (дата обращения: 18.09.2025); Шляхтина, Н. В. Традиционный народный опыт заботы о детях-сиротах в крестьянской среде дореволюционной России конца XIX в / Н. В. Шляхтина // Традиции и современность. – 2015. – № 17. – С. 99–111.

[13] Григорьев, А. В. Социальная защита в удельной общине Симбирской губернии в первой половине XIX века / А. В. Григорьев // Вестник Чувашского университета. – 2011. – № 2. – С. 53–58.

дваранскіх апек у XIX ст.[14]. У адрозненні ад расійскіх гісторыкаў, украінскія даследчыкі больш увагі надавалі не дваранскім апекам, а сіроцкім судам у кантэксце гісторыка-прававых даследаванняў[15]. Комплексна гэта праблема была раскрыта А. А. Малышавым[16]. У даследаванні С. Я. Дзегцярова і Л. Г. Паляковай[17], акрамя вылучэння рэгіянальнай спецыфікі, зроблена спроба тэарэтычнага абагульнення значэння і функцый сіроцкіх судоў у канцы XVIII – першай палове XIX ст. па ўсёй Расійскай імперыі.

У айчыннай гістарыяграфіі даследаванняў, прысвечаных праблематыцы апекі над сіротамі, даволі мала. Яны датычацца розных гістарычных перыядаў. Так, былі разгледжаны нормы магдэбургскага права і інстытут апякунства ў гарадах ВКЛ XVI–XVIII стст.[18] Грунтоўныя працы прысвечаны савецкаму перыяду. А. П. Салаўянаў разглядаў пытанне беспрытульнасці і сацыяльнай абароны непаўналетніх у Беларусі ў 1920-я гг.[19], а М. У. Смяховіч – працу дзяржаўных, палітычных і грамадскіх арганізацый БССР па ўладкаванні дзяцей-сірот у пасляваенны перыяд[20].

Час знаходжання Беларусі ў складзе Расійскай імперыі таксама закранаўся даследчыкамі, аднак комплексных прац, прысвечаных сіроцтву, няма. Пры гэтым асноўная ўвага ў кантэксце тэмы апекі засяроджвалася на другой палове XIX – пачатку XX ст. Найбольш сістэмна тэма апекі раскрыта ў манаграфіі Н. С. Маторавай, якая прааналізавала сацыяльную палітыку Расійскай імперыі на тэрыторыі беларускіх губерняў у другой палове XIX – пачатку XX ст. (структуры, якія праводзілі палітыку, крыніцы фінансавання, а таксама размеркаванне дапамогі

---

[14] Константинова, Ю. В. Діяльність органів дворянської опіки у другій половині XIX – на початку XX ст. (за матеріалами Державного архіву Херсонської області) / Ю. В. Константинова // Історичні і політологічні дослідження. Науковий журнал. – 2010. – №. 1–2 (43–44). – С. 105–111; Колесник, В. Ф. Дворянські опіки в системі державних органів Російської імперії (на матеріалах Державного архіву Житомирської області) / В. Ф. Колесник, А. М. Лоза // Наукові праці Кам'янець-Подільського національного університету імені Івана Огієнка: Історичні науки. – 2020. – Т. 30. – С. 113–123.

[15] Змерзлий, Б. В. Сирітські суди в Таврійській губернії: історія і перспективи вивчення (кінець XVIII – початок XX ст.) / Б. В. Змерзлий // Ученые записки Таврического национального университета им. В. И. Вернадского. – 2011. – Т. 24 (63), № 2. – С. 23–28; Ниметуллаева, С. С. Развитие правовых основ деятельности сиротских судов в Таврической губерний во второй половине XIX – начале XX в / С. С. Ниметуллаева // Ученые записки Крымского федерального университета имени В. И. Вернадского. Серия: Юридические науки. – 2013. – № 2–1 (1). – С. 97–105; Німетуллаєва, С. С. Правові засади діяльності сирітських судів в Таврійській губернії (кінець XVIII – початок XX ст.) : автореф. дис. ... канд. юрид. наук : 12.00.01 / Німетуллаєва Сусанна Серверовна ; Ін-т законодавства Верховної Ради України, [Таврійс. нац. ун-т ім. В. І. Вернадського]. – Київ, 2014. – 19 с.

[16] Малишев, О. О. Міські сирітські суди в Україні: історико-правове дослідження : монографія / О. О. Малишев. – Київ : Прінт-Сервіс, 2012. – 351 с.

[17] Degtyarev, S. I. Orphan Courts in the System of State Institutions of the Russian Empire of the end of the XVIII – 60s of the XIX centuries: Personal Composition, Competence, Rights and Duties of Guardians / S. I. Degtyarev, L. G. Polyakova // Bylye Gody, 2019. – Vol. 51 (1). – P. 83–92.

[18] Алексейчикова, Н. Н. Опека над несовершеннолетними детьми в белорусских городах в XVI—XVIII века : (на примере Могилева) / Н. Н. Алексейчикова // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки: научно-теоретический журнал. – 2010. – № 1. – С. 31–41; Сліж, Н. Дзеці ў сям'і гарадзенскіх мяшчан у XVI–XVII ст. / Н. Сліж // Соціум. Альманах соціальної історії. – 2020. – Вип. 15–16. – С. 359–374.

[19] Соловьянов, А. П. Социальная защита несовершеннолетних в БССР (1921–1930 гг.) / А. П. Соловьянов. – Мн. : Бел. навука, 2013. – 203 с.

[20] Смехович, Н. В. Работа государственных, политических и общественных организаций Беларуси по жизнеустройству и воспитанию детей, оставшихся без родителей: 1943–1950 гг. : автореф. дис. ... канд. ист. наук : 07.00.01 / Смехович Николай Владимирович ; Бел. гос. ун-т. – Мн., 1992. – 21 с.

пацярпелым)[21] Праблема заканадаўчага рэгулявання апекі на беларускіх землях у канцы XVIII – пачатку XX ст. была тэзісна акрэслена правазнаўцам Н. В. Дзенісенка[22] і гісторыкам К. Г. Коўшык[23]. Праз гісторыю сям'і і рода праблема сіроцтва і апекі ў дваранскім асяроддзі пададзена ў публікацыях В. М. Папко[24]. Да гісторыі дваранскіх апек у Беларусі ў больш позні перыяд другой паловы XIX – пачатку XX ст. звярнуўся В. С. Макарэвіч[25]. Беларускія навукоўцы закранал пэўныя аспекты апекі над дзяржаўнымі сялянамі, у тым ліку над сіротамі (В. Э. Загарульская[26], В. С. Крапівін[27]). Таксама даследаванні сіроцтва ў асяроддзі сялянства праводзіліся на аснове матэрыялаў фальклору этнолагамі[28].

Беларускія гісторыкі таксама вывучалі праблему сіроцтва як складовую частку гісторыі дабрачыннасці і дзейнасці грамадскіх арганізацый на тэрыторыі Беларусі (Н. С. Гардзіенка, А. У. Шыла, В. В. Кныш, С. Ф. Шымуковіч, І. В. Лебедзева)[29], аднак фокус увагі даследчыкаў у асноўным накіраваны на дзейнасць дабрачынных арганізацый другой паловы XIX – пачатку XX ст.

Шэраг даследчыкаў (Н. В. Анофранка, Т. У. Вароніч, А. Э. Сакольчык) разглядалі сумежную праблематыку – праблему падкідышаў у XIX ст.[30], прыватныя прыклады ўзаемаадносін сірот з апекуном[31].

---

[21] Моторова, Н. С. Социальная политика Российской империи на территории Беларуси (1861–1914) : монография / Н. С. Моторова. – Мн. : Нац. б-ка Беларуси, 2019. – 350 с.

[22] Денисенко, Н. В. Правовое регулирование опеки и попечительства на белорусских землях (конец XVIII – начало XX вв.) / Н. В. Денисенко // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. – 2024. – № 5 (146). – С. 66–71.

[23] Ковшик, К. Г. Институт дворянской опеки в конце XVIII в. / К. Г. Ковшик // 1917 год в исторических судьбах народов Беларуси : материалы Междунар. науч.-теор. конф., г. Минск, 22 дек. 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2017. – С. 198–200.

[24] Папко, В. М. XI нясвіжскі ардынат князь Дамінік Геранім Радзівіл (1786–1813) / В. М. Папко // Вестник Брестского государственного технического университета. Серия: Гуманитарные науки. – 2007. – № 6. – С. 24–26; Папко, В. М. Судовыя цяжбы па пытаннях маёмасці князёў Радзівілаў у першай палове XIX ст. / В. М. Папко // Системная трансформация общества: исторический опыт, современность и перспективы : сборник научных трудов кафедр социально-гуманитарных наук / М-во образования Респ. Беларусь, Брест. гос. техн. ун-т. – Брест, 2008. – Вып. 5. – С. 51–54.

[25] Макаревич, В. С. Деятельность дворянских опек по организации социальной защиты дворянства в Беларуси во второй половине XIX – начале XX в. / В. С. Макаревич // Пічэтаўскія чытанні – 2023: інстытуцыянальныя змены ў гуманітарнай сферы як адлюстраванне палітычных і эканамічных працэсаў : матэрыялы міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю аднаўлення работы БДУ на станцыі Сходня і 145-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты, Мінск, 11 кастр. 2023 г. / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2023. – С. 300–305.

[26] Загорульская, О. Э. Реформа государственной деревни Белоруссии (30-50-е гг. XIX в.) : дис. ... канд. ист. наук : 07.00.02 / Загорульская Ольга Эдуардовна ; Ин-т истории Акад. наук БССР. – Мн., 1986. – 236 с.

[27] Крапивин, В. С. Учреждения государственных имуществ на территории Беларуси (1839—1914 гг.) : дис. … канд. ист. наук : 07.00.02 / Крапивин Василий Сергеевич ; Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка. – Мн., 2021. – 242 с.

[28] Самохіна, А. М. Міфасемантыка сувязяў «сірата – слёзы – дождж» у беларускай традыцыйнай культуры / А. М. Самохіна // Известия Гомельского государственного университета имени Ф. Скорины. Серия: Гуманитарные науки. – 2020. – № 1 (118). – С. 127–131; Шарая, В. М. Уяўленні пра сірату ў традыцыйнай культуры беларусаў: асаблівасці вывучэння і перспектывы даследавання / В. М. Шарая // Acta Albaruthenica. – 2020. – Т. 20. – С. 67–85.

[29] Гардзіенка, Н. С. Становішча жанчыны-шляхцянкі ў Вялікім княстве Літоўскім у XVIII ст. : аўтарэф. дыс. …. канд. гіст. навук : 07.00.02: / Гардзіенка Наталля Сяргееўна ; Бел. дзярж. ун-т. – Мн., 2003. – 20 с.; Шило, Е. В. Формы и особенности дворянской благотворительности на белорусских землях Российской империи в первой половине XIX в. / Е. В. Шило // Российские и славянские исследования : науч. сб. / Бел. гос. ун-т. – Мн., 2014. – Вып. 9. – С. 101–112; Кныш, О. В. Развитие благотворительности на территории Беларуси в 60–90-е гг. XIX в. / О. В. Кныш // Працы гістарычнага факультэта БДУ : навук. зб. / Бел. дзярж. ун-т. — Мн., 2009. — Вып. 4. – С. 269–276; Шимукович, С. Ф. Благотворительность в Беларуси в конце XIX – начале XX века : монография / С. Ф. Шимукович. – Мн. : Акад. упр. при Президенте Респ. Беларусь, 2006. – 188 с.; Лебедзева, І. В. Арганізацыя і дзейнасць дзіцячых дабрачынных устаноў у Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. (па матэрыялах фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / І. В. Лебедзева // Здабыткі: дакументальныя помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі. – Вып. 22. – Мн., 2019. – С. 257–269.

[30] Анофранка, Н. В. Праблемы падкідышаў у Мінску ў 30—50 гг. XIX ст. / Н. В. Анофранка // Мінск і мінчане: дзесяць стагоддзяў гісторыі: да 955-годдзя горада : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі; уклад.

Такім чынам, з гістарыяграфічнага агляду паўстае тэматычная фрагментарнасць, геаграфічная і храналагічная абмежаванасць. Гэта абумоўлівае неабходнасць сістэмнага даследавання заканадаўства аб ахове правоў сірот і яго практычнай рэалізацыі ва ўсіх саслоўях Расійскай імперыі канца XVIII – першай паловы XIX ст., а таксама вылучэння асаблівасцяў станаўлення і развіцця саслоўнай апекі на тэрыторыі Беларусі.

*У раздзеле 1.2 «Крыніцы»* раскрываецца спецыфіка дакументальнай базы дысертацыі. Група заканадаўчых матэрыялаў прадстаўлена юрыдычнымі помнікамі 2 прававых сістэм – Вялікага Княства Літоўскага і Расійскай імперыі. У працы выкарыстаны Статут ВКЛ 1588 г. Заканадаўчыя крыніцы Расійскай імперыі прадстаўлены як асобнымі актамі і палажэннямі, выкладзенымі ў «Полном собрании законов Российской империи», так і кадыфікаванымі зборнікамі законаў – «Сводами законов Российской империи» (1832, 1842 і 1857 гг.). Неапублікаваныя дакументы па гісторыі развіцця заканадаўства, палажэнні, якія абмяркоўваліся ў вышэйшых інстанцыях Расійскай імперыі, змешчаны ў фондах №№ 1284 і 1287 Расійскага дзяржаўнага гістарычнага архіва.

З матэрыялаў Нацыянальныга гістарычнага архіва Беларусі ў працы былі выкарыстаны матэрыялы фондаў дваранскіх апек (693, 1463, 2072, 2073, 2074, 2076, 2549, 2616, 2659, 2801); сіроцкіх судоў (19, 2140, 2516, 3143); прыказаў грамадскай апекі (2638, 3348); губернскіх праўленняў (299, 3219); канцылярый грамадзянскіх губернатараў (295, 1430); канцылярый губернскіх прадвадзіцеляў дваранства (320, 2626); царкоўных інстанцый праваслаўнай канфесіі (136, 130, 2299); судовых інстанцый і гарадскіх устаноў (159, 145, 2620, 2647). Былі выкарыстаны дакументы з фондаў Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна: дваранскіх апек (865, 1539); губернскіх праўленняў і судовых устаноў (2, 98, 586) і Брэсцкай уніяцкай кансісторыі (1621).

Дакументы справаводства ўключаюць у сябе некалькі груп: журналы пасяджэнняў калегіяльных устаноў, матэрыялы справаздачнага характару (у першую чаргу – справаздачы апекуноў), прашэнні і звароты прыватных асоб у розныя ўстановы губернскага і павятовага маштабу, дакументы ўліковага парадку (рэестры, спісы, ведамасці). Апублікаваныя справаводчыя матэрыялы змешчаны ў даведачных зборніках дакументаў.

---

Р. А Аляхновіч; рэдкал. В. Л. Лакіза [і інш.]. — Мн.: Бел. навука, 2023. — С. 217–229; Сакольчык, А. Э. Праблема падкідышаў у гісторыі сям'і беларускага грамадства другой паловы XIX ст. / А. Э. Сакольчык / Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: вопыт міждысцыплінарных даследаванняў : зб навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2025. – С. 148–164; Воронич, Т. В. Убийство новорожденных как социальное явление жизни города Беларуси конца XIX — начала XX в. / Т. В. Воронич // Гісторыка-этнаграфічныя і дэмаграфічныя аспекты даследавання сям'і: вынікі, праблемы, перспектывы : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. В. В. Яноўская, Р. У. Зянюк ; рэдкал. В В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн., 2018. – С. 45–49.

[31] Анофранка, Н. Малавядомая старонка гісторыі роду Вайніловічаў (пачатак 30-х гг. XIX ст.) / Н. Анофранка // Беларусь, Смалявіцкі край і Эдвард Вайніловіч : матэрыялы навук.-практ. канф., г. Смалявічы, 7 кастр. 2022 г. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі ; рэдкал.: А. А. Каваленя (навук. рэд.), У. С. Пуцік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2022. – С. 33–49.

Крыніцамі з комплексу матэрыялаў перыядычнага друку з'яўляюцца выпускі клерыкальна-філантрапічнага часопіса «Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej z wiadomościami ku wydoskonaleniu jej służącemi», у якім асвятляліся некаторыя аспекты філантрапічнай дзейнасці, накіраваныя на выхаванне сірот дваранскага паходжання.

Відавая разнастайнасць выкарыстаных крыніц забяспечыла дастатковую рэпрэзентатыўнасць і даставернасць, а інфармацыйны патэнцыял дазволіў з розных бакоў раскрыць аспекты станаўлення і функцыянавання саслоўнай апекі над сіротамі.

*У раздзеле 1.3 «Метадалогія даследавання»* паказана, што даследаванне грунтуецца на прынцыпах гістарызму, аб'ектыўнасці і сістэмнасці, а таксама выкарыстанні агульнанавуковых (апісанне, аналіз, сінтэз, параўнанне, дэдукцыя і індукцыя) і спецыяльна-гістарычных метадаў (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны).

Другая глава **«Прававое рэгуляванне па забеспячэнні інтарэсаў дзяцей-сірот»** прысвечана заканадаўству, якое забяспечвала функцыянаванне саслоўнай апекі над сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг., выяўлены этапы ў яго станаўленні і развіцці.

*У раздзеле 2.1 «Заканадаўства па ахове правоў сірот дваранскага саслоўя»* адлюстравана прававое афармленне апекі над дзецьмі-сіротамі дваранскага саслоўя на падставе Статута ВКЛ 1588 г. і акта імператрыцы Расійскай імперыі Кацярыны II «Учреждения для управления губерний Всероссийской империи» 1775 г. Паказаны рэгламент узяцця пад апеку паводле абодвух прававых дакументаў, вызначаны прынцып апекі. Разгледжана спецыфіка распаўсюджання расійскага заканадаўства аб апецы на тэрыторыю былога ВКЛ.

*У раздзеле 2.2 «Прававое афармленне апекі над сіротамі гарадскіх абывацеляў»* прааналізаваны нормы магдэбургскага права, якое рэгулявала апеку над сіротамі ў гарадах у XVI–XVIII стст., выяўлены правілы функцыянавання сіроцкіх судоў на аснове «Учреждений о губерниях» 1775 г. Прадстаўлены рэгламент дзеянняў устаноў, вызначаны правілы продажу маёмасці сірот.

*У раздзеле 2.3 «Заканадаўчая рэгламентацыя апекі ў дачыненні да сірот духоўнага саслоўя»* устаноўлена, што спецыяльнае прававое рэгуляванне апекі тычылася толькі сірот праваслаўнага і ўніяцкага духавенства. Выяўлены генезіс прававога афармлення апекі ў праваслаўнай канфесіі ад асобных правіл аб спосабах уладкавання сірот да заснавання епархіяльных папячыцельстваў аб бедных духоўнага звання. Паказаны асаблівасці заканадаўчага рэгулявання апекі над сіротамі ўніяцкага духавенства.

*У раздзеле 2.4 «Прававыя нормы арганізацыі апекі над сіротамі саслоўя сельскіх абывацеляў»* разгледжана заканадаўчае рэгуляванне апекі над сіротамі ўдзельных і дзяржаўных сялян, для апошняй катэгорыі – яе развіццё ў сувязі з

рэформай дзяржаўнай вёскі П. Д. Кісялёва 1837–1841 гг., асаблівасці гэтых новаўвядзенняў у розных губернях на тэрыторыі Беларусі. Выяўлена, што апека над сіротамі прыватнаўласніцкіх сялян не была афармлена ў праве Расійскай імперыі.

У трэцяй главе **«Інстытуцыяналізацыя саслоўнай апекі дваранскіх сірот»** прадстаўлена функцыянаванне апекі над сіротамі ў межах дваранскага саслоўя, вылучана спецыфіка яе практычнай рэалізацыі на тэрыторыі Беларусі.

*У раздзеле 3.1 «Стварэнне і дзейнасць дваранскіх апек»* адлюстравана практычная дзейнасць дваранскіх апек і раскрываецца яе адпаведнасць закладзенаму ў заканадаўстве рэгламенту. Вылучана спецыфіка апекі над дваранскімі сіротамі на землях былога ВКЛ, звязаная з працэсам «разбору шляхты» і больш познім увядзеннем расійскага заканадаўства аб дваранскіх апеках. Паказана дзеянне маёмаснацэнтрычнага прыцыпу апекі на практыцы.

*У раздзеле 3.2 «Матэрыяльна-фінансавае становішча, адукацыя, выхаванне дзяцей-сірот дваранства»* паказана, як дваранскія апекі і апекуны вырашалі праблему забеспячэння базавых і дадатковых патрэб дзяцей-сірот. Вылучаны крыніцы фінансавага ўтрымання сірот і спосабы іх выхавання. Праз аналіз выдаткаў апекуноў у адпаведных справаздачах раскрыты аспекты паўсядзённасці сірот. Паказаны асаблівасці адукацыі дваранскіх сірот і роля ў гэтым мецэнацкіх фундушаў.

У чацвёртай главе **«Ахова інтарэсаў сірот гарадскіх абывацеляў»** разгледжана дзеянне на практыцы на тэрыторыі Беларусі інстытута саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі гарадскіх абывацеляў.

*У раздзеле 4.1 «Функцыянаванне сіроцкіх судоў»* паказана практычная дзейнасць сіроцкіх судоў на тэрыторыі Беларусі, іх арганізацыйная і этнаканфесійная спецыфіка ў параўнанні з іншымі губернямі Расійскай імперыі. Адзначана, што сіроцкія суды дзейнічалі адпаведна рэгламенту і пэўнай паслядоўнасці, а апека грунтавалася на маёмаснацэнтрычным прынцыпе.

*У раздзеле 4.2 «Практыкі забеспячэння матэрыяльных і адукацыйных патрэб дзяцей-сірот гарадскіх абывацеляў»* выяўлены спосабы выхавання і адукацыі сірот гарадскіх абывацеляў, у тым ліку – засваенне пэўнай прафесіі. Вылучаны асаблівасці апекі, звязаныя з уладкаваннем сірот, якія не мелі ні маёмасці, ні сваякоў.

У пятай главе **«Апека над дзецьмі-сіротамі ў саслоўях духавенства і сельскіх абывацеляў»** раскрыты неінстытуцыяналізаваныя формы апекі над сіротамі ў двух саслоўях – духавенстве і сельскіх абывацеляў.

*У разделе 5.1 «Ажыццяўленне апекі над сіротамі ў саслоўі духавенства»* адлюстраваны практыкі абароны правоў сірот праваслаўнага і ўніяцкага духавенства. У дачыненні да праваслаўнай канфесіі вылучаны этапы развіцця саслоўнай апекі, выяўлена гендарная розніца ў спосабах уладкавання дзяцей-сірот.

Адзначана, што ў адносінах да сірот уніяцкага духавенства апека насіла несістэмны характар.

*У раздзеле 5.2 «Адаптацыя да жыцця ў соцыўме дзяцей-сірот сельскіх абывацеляў»* выяўлены асноўныя спосабы апекі над сіротамі прыватнаўласніцкіх сялян. Паказана, як сялянскія сіроты, якія заставаліся без належнай апекі па-за межамі абшчыны, падвяргаліся маргіналізацыі.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

### Асноўныя навуковыя вынікі дысертацыі

1. Заканадаўства аб апецы над дзецьмі-сіротамі ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. было пабудавана на саслоўных прынцыпах і не было агульным. Да падзелаў Рэчы Паспалітай апека над сіротамі шляхты і мяшчанства, хоць і грунтавалася на нормах Статута ВКЛ і магдэбургскага права, не была аформлена ў асобны інстытут.

Пасля далучэння да Расійскай імперыі на землі былога ВКЛ распаўсюджвалася расійскае заканадаўства. З 1775 г. ствараліся дзяржаўныя інстытуты саслоўнай апекі для дваран і гарадскіх абывацеляў – дваранскія апекі і сіроцкія суды. Вылучаліся два этапы ў развіцці прававога рэгулявання апекі над дзецьмі-сіротамі дваранства і гарадскіх абывацеляў: 1) 1775–1834 гг. – паралельнае выкарыстанне норм Статута ВКЛ аб апецы і расійскага заканадаўства (указы і акты імператара, Сената і г. д.); 2) 1835–1861 гг. – кадыфікацыя права і ўвядзенне ва ўсеагульны імперскі ўжытак тома X «Свода законов Российской империи» («Законы гражданские»).

У сілу спецыфікі канфесійнай палітыкі ў Расійскай імперыі, а таксама правіл веравучэнняў розных цэркваў, правілы апекі над сіротамі ў духоўным саслоўі датычыліся толькі прадстаўнікоў праваслаўнай царквы і ўніяцкай (да 1839 г.). Умяшальніцтва дзяржавы ў рэгламентацыю апекі над сіротамі праваслаўнага і ўніяцкага святарства было мінімальнае, правілы складаліся ўнутры саміх цэркваў. Гэта абумовіла асобную перыядызацыю ў развіцці заканадаўства: 1) 1799–1822 гг. – развіццё апекі па шляху карпаратыўнай адказнасці і размеркавання грошай унутры царквы без вылучэння ўпаўнаважаных структур; 2) 1823–1861 гг. – стварэнне і дзейнасць епархіяльных папячыцельстваў аб бедных духоўнага звання, якія размяркоўвалі фінансавую падтрымку паміж сіротамі праваслаўнага духавенства. У дачыненні да ўніяцкай царквы не склалася акрэсленых форм і правіл апекі.

Агульнага прававога рэгламентавання апекі над дзецьмі-сіротамі саслоўя сельскіх абывацеляў не было. У 1797 г. расійскім урадам былі распрацаваны правілы для ўдзельных і дзяржаўных сялян. Для дзяржаўных сялян былі ўнесены дапаўненні падчас рэформы дзяржаўнай вёскі 1837–1841 гг. У дачыненні да сірот

прыватнаўласніцкіх (прыгонных) сялян органы дзяржаўнай улады не праявілі зацікаўленасці да прававога афармлення іх апекі [2; 5; 9; 10].

2. Апека над дваранскімі сіротамі на тэрыторыі Беларусі мела спецыфіку. Па-першае, у канцы XVIII – пачатку XIX ст. яна магла ажыццяўляцца павятовымі судамі пры выкарыстанні норм Статута ВКЛ 1588 г. Па-другое, калі ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях з канца XVIII ст. засноўваліся дваранскія апекі, то ў Гродзенскай і Віленскай апека рэгулявалася Галоўным судом, а дваранскія апекі засноўваліся пазней. Па-трэцяе, яна адбывалася ва ўмовах працэсу інтэграцыі вышэйшага саслоўя былой Рэчы Паспалітай у дваранства Расійскай імперыі, таму сіроты, якія не пацвердзілі дваранскае паходжанне, знаходзіліся ў складаным становішчы. З 1775 г. у паветах беларускіх губерняў пачалі засноўвацца інстытуты – дваранскія апекі. Праца гэтых устаноў мела пэўную паслядоўнасць (узяцце пад апеку, прызначэнне апекуна, апісанне маёмасці памерлых, кантроль дзейнасці апекуноў). Адказнасць за клопат над сіротамі і іх маёмасцю ўскладалася на апекуноў, якія маглі быць як «натуральнымі» (маці ці бацька), так і прызначанымі (сваякі-мужчыны дваранскага саслоўя або забяспечаныя дваране таго ж павета). Апека грунтавалася на маёмаснацэнтрычным прынцыпе, таму галоўнай яе задачай было захаванне маёмасці сірот у цэласці. Апека над сіротамі цягнулася да іх паўналецця ў 17 гадоў, а з 17 да 21 года, пакуль сіроты не мелі некаторых фінансава-маёмасных правоў, да іх мог быць прызначаны папячыцель.

Малы памер (5% з даходаў маёнтка сірот) і нерэгулярнасць выплат узнагароджання апекунам паўплывала на іх частую ратацыю, што адмоўна адбівалася на становішчы сірот і іх гаспадарак. Дваранскія апекі спрабавалі заахвоціць добрасумленных апекуноў дзяржаўнымі ўзнагародамі (і, адпаведна, павышэннем іх рангу).

Іншай задачай апекі быў клопат непасрэдна пра асобу сіраты. Фінансавае забеспячэнне дваранскіх сірот да іх паўналецця складалася з некалькіх крыніц (даходы маёнткаў, працэнты ад капіталаўкладанняў у крэдытныя ўстановы і сродкі апекуноў). Выхаванне дзяцей-сірот дваранскага саслоўя падзялялася на хатняе і пазахатняе. Дома выхоўваліся ўсе дзеці ў малым узросце і ў многіх выпадках дзяўчынкі незалежна ад узросту, што абумовіла высокую інфарматыўнасць дакументальных крыніц аб іх паўсядзённым жыцці. Пазахатняе выхаванне, якое часцей атрымлівалі хлопчыкі, ажыццяўлялася ў навучальна-выхаваўчых установах для дзяцей і ва ўстановах, якія давалі прытулак і мінімальны клопат. Спансіраваць адукацыю для дваранскіх сірот маглі завешчаныя мецэнатамі фундушы, на месцы якіх існаваў конкурс. Пацверджанае дваранскае паходжанне сірот магло выступаць абавязковай умовай для іх вылучэння на гэтыя месцы [1; 5; 6; 7; 11; 12; 13].

3. Сіроты гарадскіх абывацеляў у канцы XVIII – першай палове XIX ст. апекаваліся саслоўнымі інстытутамі – сіроцкімі судамі. Іх дзейнасць была цесна звязана з гарадавымі магістратамі. У канцы XVIII – пачатку XIX ст. у сілу

запаволенага заснавання сіроцкіх судоў апекай над сіротамі гарадскога саслоўя займаліся і іншыя ўстановы судовай і выканаўчай галін, прымяняліся нормы Статута ВКЛ 1588 г. Сіроцкія суды вялі разгалінаваную працу, аднак асноўным накірункам была апека непаўналетніх дзяцей гарадскіх абывацеляў і асабістых дваран. У адрозненне ад унутраных расійскіх губерняў, яны не апекавалі прадстаўнікоў іншых саслоўяў, за выключэннем аднадворцаў – нашчадкаў былой шляхты ВКЛ, і не прыцягваліся да працы прытулкаў і багадзелень. Як і ў выпадку дваранскіх апек, справы сірот заводзіліся на падставе прашэнняў, а апекунамі прызначалі ў большасці выпадкаў сваякоў-мужчын. Пры гэтым ратацыя апекуноў была меншай, чым у дваран.

Этнаканфесійнай спецыфікай сіроцкіх судоў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губерняў з’яўлялася перавага ў справаводстве спраў яўрэйскіх дзяцей-сірот, што было абумоўлена істотнай вагой яўрэйскага насельніцтва ў гарадах, але не стварала асобных форм іх апекі. Аднак былі асаблівасці зняцця апекі, якое запавольвалася па прычыне нявызначанасці ў пытанні паўналецця і скажэнняў узросту яўрэйскіх дзяцей у справаводстве кагалаў.

Агульнымі з дваранскімі апекамі былі паслядоўнасць працы сіроцкіх судоў, правілы продажу нерухомай маёмасці сірот, завяршэння апекі, прызначэння папячыцеляў. Прасочваўся выразны маёмаснацэнтрычны прынцып апекі. Злоўжыванні апекуноў вымушалі гарадскія і губернскія органы выканаўчай і судовай улады ўмешвацца ў працу сіроцкіх судоў. Апека з сірот здымалася па дасягненні імі 17-гадовага ўзросту, аднак у сувязі з пэўнымі абставінамі гэты працэс мог зацягнуцца.

Дзеці-сіроты або выхоўваліся (і навучаліся) дома, або атрымлівалі адукацыю ў дзяржаўных, прыватных і рэлігійных (іудзеі) навучальных установах. Дзеля пераймання гандлёвай або рамеснай справы бацькоў яны нярэдка атрымлівалі адпаведную прафесійную адукацыю. Дзяцей, якія не мелі ні маёмасці, ні сваякоў, уладкоўвалі на навучанне да рамесніка (з якім апекун складаў пісьмовую дамову) або да гараджан на выхаванне, аднак размыванне адказнасці за гэтае ўладкаванне паміж сіроцкімі судамі і прыказамі грамадскай апекі адмоўна адбівалася на палажэнні сірот [8].

4. У саслоўі духавенства (у першую чаргу праваслаўнага і да 1839 г. уніяцкага) не склалася дзяржаўных інстытутаў апекі над дзецьмі-сіротамі, бо апека рэгулявалася ў межах царкоўных інстанцый па шляху карпаратыўнай адказнасці. У развіцці апекі праваслаўнага духавенства вылучаліся два этапы: 1) 1799–1822 гг. – станаўленне форм апекі над сіротамі праваслаўнага духавенства і 2) 1823–1861 гг. – дзейнасць папячыцельстваў аб бедных духоўнага звання. На першым этапе апека над сіротамі епархіі рэгулявалася кансісторыяй, а яе паслядоўнасць была аналагічнай дзейнасці дваранскіх апек і сіроцкіх судоў: паведамленне ў кансісторыю, апісанне маёмасці памерлага, прызначэнне апекуна. Аднак пры

адсутнасці канфліктаў кансісторыя не кантралявала апекуноў, а тыя не атрымлівалі ніякага ўзнагароджання.

Апека над сіротамі духоўнага саслоўя прадугледжвала ў якасці вядучай формы дапамогі грашовыя выплаты. На іх памер уплывала некалькі фактараў: узрост, маральнае аблічча, наяўнасць калецтваў і дадатковых крыніц даходаў. На першым этапе развіцця апекі выплаты рабіліся за кошт даходаў царквы або дабрачыннасці магнатаў, а на другім этапе іх сталі размяркоўваць папячыцельствы аб бедных духоўнага звання з сабраных грошай у епархіі.

Галоўнай мэтай апекі было захаванне замкнёнасці і функцыянавання духоўнага саслоўя. У адпаведнасці з ім, апекунамі станавіліся пераважна духоўныя асобы, хлопчыкі-сіроты рыхтаваліся стаць святарамі і ўтрымліваліся ў семінарыях. Дзяўчынкі ж забяспечваліся сродкамі апекуноў, за кошт царкоўных даходаў або грашовай рэнты. Таксама яны маглі выхоўвацца ў манастырах.

Створаныя ў 1823 г. папячыцельствы аб бедных духоўнага звання выступалі ў ролі ўстаноў па размеркаванні фінансавай дапамогі сіротам. Апекуны пры гэтым прызначаліся не заўжды, а толькі пры наяўнасці нерухомай маёмасці і не ўладкаваных ні ў якую ўстанову сірот. Акрамя малалетніх сірот, выплаты маглі таксама вылучацца паўналетнім сіротам-калекам і новарукапакладзеным святарам, якія ўступалі ў шлюб з сіротамі праваслаўнага духавенства.

Да 1839 г. апека над дзецьмі-сіротамі ўніяцкай канфесіі рэгулявалася мітрапалітам і кансісторыямі, аднак сістэмнага падыходу не склалася. На працягу аднаго года (а часта і больш працяглы тэрмін) удовы і сіроты мелі права карыстацца зямлёй і часткай царкоўных даходаў. Хлопчыкі па сканчэнні семінарый атрымлівалі месца святара, а дзяўчынкі заахвочваліся да шлюбу з духоўнымі асобамі, якія маглі заняць прыход іх памерлага бацькі [4].

5. Апека над дзецьмі-сіротамі саслоўя сельскіх абывацеляў не была інстытуцыяналізаваная і залежала ад катэгорыі сялян. Калі для ўдзельных і дзяржаўных сялян распрацоўваліся некаторыя правілы апекі, якія выконваліся на практыцы, то ў выпадку прыватнаўласніцкіх сялян дзяржаўныя органы разлічвалі на адказнасць і ўзаемадапамогу, з аднаго боку, унутры сялянскай абшчыны, з другога – на клопат памешчыкаў аб сваіх прыгонных. Дадатковым уплывам валодала хрысціянская царква, прадстаўнікі якой маглі быць апекунамі сялянскіх сірот, арганізоўваць іх навучанне грамаце. З боку дзяржавы апекай над сіротамі сельскіх абывацеляў у выключных выпадках займаліся губернскія прыказы грамадскай апекі, якія ўладкоўвалі дзяцей да выхавацеляў або вярталі іх памешчыкам.

Беспрытульныя сялянскія сіроты ў падлеткавым узросце часта падвяргаліся маргіналізацыі. Пакаранне за бадзяжніцтва і жабрацтва залежала ад полавай прыналежнасці і ўзросту сірот. У выпадку доказанай прыналежнасці да памешчыка дзяцей вярталі яму. Калі ўладальнік не быў знойдзены, хлопчыкаў адпраўлялі на

ваенную службу, а дзяўчынак пакідалі ва ўстановах прыказаў грамадскай апекі. Гэтыя дзеці па дасягненні паўналецця маглі прыпісацца да асабіста свабодных падатковых саслоўных груп. Дзяржаўная ўлада праяўляла пэўную індыферэнтнасць у адносінах да беспрытульных сірот нявызначанага паходжання. З аднаго боку, яна не стварала спецыяльных устаноў апекі, а з іншага – не была зацікаўлена ў павелічэнні колькасці прыгоннага сялянства за іх кошт [3].

**Рэкамендацыі па практычным выкарыстанні вынікаў**

Вынікі дысертацыйнага даследавання былі выкарыстаны ў практычнай дзейнасці аддзела навуковай творчасці ўстановы адукацыі «Мінскі дзяржаўны палац дзяцей і моладзі» пры правядзенні гарадскога конкурса па гісторыі «XIX век: время перемен» для вучняў 8-х класаў (акт укаранення №1 ад 19.12.2025).

Высновы і абагульненні дадзенай дысертацыйнай працы могуць стаць падставай для правядзення далейшага навуковага даследавання праблем, закранутых у дысертацыі: разгляд працэсаў станаўлення дзяржаўнага апарату Расійскай імперыі, асобных сфер дзейнасці дзяржаўных інстытутаў (сацыяльная абарона, адукацыя, дабрачыннасць і г. д.), асаблівасці гэтых працэсаў на тэрыторыі Беларусі.

Матэрыялы і вынікі дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых манаграфій (у тым ліку калектыўных), абагульняючых прац па гісторыі Беларусі, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, навукова-папулярных прац, а таксама пры стварэнні музейных экспазіцый, прысвечаных выхаванню, адукацыі і дабрачыннай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі.

Дысертацыйныя матэрыялы могуць знайсці прымяненне ў навучальным працэсе пры выкладанні курсаў па гісторыі Беларусі, спецыялізаваных курсаў па сацыяльнай гісторыі (у тым ліку гісторыі дзяцінства) Беларусі і гістарычнай антрапалогіі.

# СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА

## Артыкулы ў часопісах і зборніках, якія адпавядаюць п. 19 Палажэння аб прысуджэнні вучоных ступеняў і прысваенні вучоных званняў у Рэспубліцы Беларусь

1. Кімбар (Пышкала), К. Р. Дзейнасць дваранскай апекі ў беларуска-літоўскіх губернях у першай палове XIX ст. (на прыкладзе малалетніх сірот Лускіных) / К. Р. Кімбар // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы : исследования по Новой и Новейшей истории : сб. науч. тр. / Респ. ин-т высш. шк. – Мн., 2023. – Вып. 7 : в 2 ч. – Ч. 2. – С. 78–85.

2. Пышкала, К. Р. Прававыя асновы ўнутрысаслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях (канец XVIII – першая палова XIX ст.) / К. Р. Пышкала // Гістарычна-археалагічны зборнік. – Мн., 2024. – Вып. 38. – С. 108–116.

3. Пышкало, Е. Г. Детское сиротство в сословии сельских обывателей в первой половине XIX в. (по материалам Витебской и Минской губерний) / Е. Г. Пышкало // Вестник Брянского государственного университета. – 2024. – № 4 (62). – С. 99–107.

4. Пышкала, К. Р. Ажыццяўленне апекі над дзецьмі-сіротамі праваслаўнага духавенства ў беларуска-літоўскіх губернях (1799–1860 гг.) / К. Р. Пышкала // Гістарычна-археалагічны зборнік – Мн., 2025. – Вып. 39. – С. 31–40.

## Артыкулы ў іншых перыядычных навуковых выданнях і зборніках навуковых прац

5. Кімбар (Пышкала), К. Р. Рэалізацыя правілаў для апекуноў у практычнай дзейнасці дваранскіх апек у беларуска-літоўскіх губернях (30–50-я гады XIX ст.) / К. Р. Кімбар // ARS LONGA: навуковыя дасягненні і перспектывы : зб. нав. арт. / Ін-т гісторыі Нац. акад. навук Беларусі ; уклад. Т. В. Даўгач ; рэдкал.: В. Л. Лакіза [і інш.]. – Мн., 2024. – Вып. 1. – С. 104–113.

6. Пышкала, К. Р. Разгляд канфліктнай справы паміж сваякамі-дваранамі ў Віцебскім павятовым судзе ў 1827–1836 гг. / К. Р. Пышкала // Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі : зб навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2024. – С. 248–260.

7. Пышкала, К. Р. Пошук пацвярджэнняў дваранскага паходжання сірот губернскімі і павятовымі інстанцыямі Магілёўскай і Мінскай губерняў у 40-50-я гг. XIX ст. / К. Р. Пышкала // Генеалогія і сямейная гісторыя Беларусі: вопыт міждысцыплінарных даследаванняў : зб навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі,

Цэнтр. навук. б-ка імя Я. Коласа ; уклад.: В. В. Урублеўскі ; рэдкал.: С. С. Юрэцкі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2025. – С. 136–147.

8. Пышкала, К. Р. Дзейнасць Мінскага сіроцкага суда ў 30–50-х гадах XIX ст. / К. Р. Пышкала // Мінск і мінчане: дзесяць гадоў гісторыі : старонкі гарадскога жыцця : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; уклад. Р. А. Аляхновіч ; рэдкал.: В. Л. Лакіза (гал. рэд.) [і інш]. – Мн., 2025. – С. 291–299.

## Матэрыялы навуковых канферэнцый

9. Кімбар (Пышкала), К. Р. Заканадаўчыя асновы дзейнасці сіроцкіх судоў на беларускіх землях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. / К. Р. Кімбар // Пічэтаўскія чытанні – 2023: інстытуцыянальныя змены ў гуманітарнай сферы як адлюстраванне палітычных і эканамічных працэсаў. Матэрыялы міжнар. навук. канф., прысвеч. 80-годдзю аднаўлення работы БДУ на станцыі Сходня і 145-годдзю з дня нараджэння У. І. Пічэты. Мінск, 11 кастр. 2023 г. / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал. А. Г. Каханоўскі (гал рэд.) [і інш.]. – Мн., 2023. – С. 267–274.

10. Кімбар (Пышкала), К. Р. Развіццё заканадаўства аб дзейнасці дваранскіх апек у беларускіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. / К. Р. Кімбар // Мадэрнізацыя і працэсы сацыяльных трансфармацый у Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XXI стагоддзя : матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 17 лістап. 2023 г. / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Г. Каханоўскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2023. – С. 88–96.

11. Кімбар (Пышкала), К. Р. Фінансавае забеспячэнне дзяцей-сірот у беларуска-літоўскіх губернях у першай палове XIX ст. (паводле дакументаў фондаў дваранскіх апек) / К. Р. Кімбар // Архівы і архівісты Беларусі: рух па шляху развіцця. Матэрыялы навук.-практ. канф., прысвеч. 85-годдзю Нац. гіст. архіва Беларусі (Мінск, 4 ліп. 2023 г.) / Нац. гіст. архіў Беларусі ; рэдкал. А. Л. Воінаў (старш.) [і інш.]. – Мн., 2024. – С. 92–103.

12. Пышкала, К. Р. «Dzieje Dobroczynności Krajowej i Zagranicznej» як гістарычная крыніца па пытаннях апекі над дзецьмі-сіротамі ў беларуска-літоўскіх губернях пачатку XIX ст. (з фонду НББ) / К. Р. Пышкала // Библиотека в XXI веке: деятельность, инициативы и результаты = Library in the XXI century: activities, initiatives and results : материалы XV Междунар. науч.-практ. конф. молодых ученых и специалистов, Минск, 20 февр. 2024 г. / Нац. акад. наук Беларуси, Центр. науч. б-ка им. Я. Коласа ; сост.: Ю. А. Переверзева [и др.] ; редкол.: М. П. Ахремчик, Ю. А. Переверзева (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2024. – С. 205–210.

13. Пышкала, К. Р. Арганізацыя і дзейнасць дваранскіх апек у беларуска-літоўскіх губернях у канцы XVIII – першай палове XIX ст. / К. Р. Пышкала // «Долгий XIX век» в истории Беларуси и Восточной Европы: Материалы VII Междунар. науч. конф., Минск, 22–23 мая 2025 г. / Бел. гос. эконом. ун-т, Ин-т

истории Нац. акад. наук Беларуси, Респ. ин-т высш. шк. ; редкол.: С. Ф. Шимукович (отв. ред.) [и др.]. – Мн., 2025 – С. 148–155.

## РЭЗЮМЭ

Пышкала Кацярына Рыгораўна

**Саслоўная апека над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі (1772–1861 гг.)**

***Ключавыя словы:*** апека, Беларусь, гарадскія абывацелі, дваранская апека, дваранства, духавенства, прававое рэгуляванне, саслоўі, сельскія абывацелі, сіроты, сіроцкі суд.

***Мэта даследавання*** – выяўленне прававых асноў, форм і асаблівасцей саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг.

***Метады даследавання.*** Выкарыстаны агульнанавуковыя (апісанне, аналіз, параўнанне і сінтэз, індукцыя і дэдукцыя) і спецыяльна-гістарычныя (гісторыка-генетычны, гісторыка-параўнальны, гісторыка-тыпалагічны) метады для вырашэння пастаўленых задач і дасягнення мэты даследавання.

***Атрыманыя вынікі і іх навізна.*** Ахарактарызаваны прававыя асновы, вызначаны формы, асаблівасці, выяўлена эвалюцыя станаўлення і развіцця саслоўнай апекі над дзецьмі-сіротамі на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1861 гг. Упершыню ў айчыннай гістарыяграфіі раскрыта роля дваранскіх апек і сіроцкіх судоў як саслоўных інстытутаў апекі для дваранства і гарадскіх абывацеляў, выяўлены і ахарактарызаваны этапы станаўлення і развіцця апекі над дзецьмі-сіротамі ў саслоўі духавенства, вызначаны формы апекі над сіротамі сельскіх абывацеляў, адзначаны яе асаблівасці ў Віленскай, Віцебскай, Гродзенскай, Магілёўскай і Мінскай губернях.

***Рэкамендацыі па выкарыстанні.*** Матэрыялы даследавання могуць быць выкарыстаны пры напісанні навуковых прац па гісторыі Беларусі, стварэнні музейных экспазіцый, прысвечаных выхаванню, адукацыі і дабрачыннай дзейнасці на тэрыторыі Беларусі, а таксама ў навучальным працэсе пры выкладанні курсаў па гісторыі Беларусі, спецыялізаваных курсаў па сацыяльнай гісторыі (у тым ліку гісторыі дзяцінства) Беларусі і гістарычнай антрапалогіі.

***Галіна выкарыстання.*** Матэрыялы дысертацыйнага даследавання могуць быць выкарыстаны ў навучальным працэсе на сацыягуманістарных факультэтах вышэйшых навучальных устаноў, у музейнай сферы.

# РЕЗЮМЕ


Пышкало Екатерина Григорьевна

**Сословная опека над детьми-сиротами на территории Беларуси (1772–1861 гг.)**

***Ключевые слова:*** опека, Беларусь, городские обыватели, дворянская опека, дворянство, духовенство, правовое регулирование, сословия, сельские обыватели, сироты, сиротский суд.

***Цель исследования*** – выявление правовых основ, форм и особенностей сословной опеки детей-сирот на территории Беларуси в 1772–1861 гг.

***Методы исследования.*** Использованы общенаучные (описание, анализ, сравнение и синтез, индукция и дедукция) и специально-исторические (историко-генетический, историко-сравнительный, историко-типологический) методы для решения поставленных задач и достижения цели исследования.

***Полученные результаты и их новизна.*** Охарактеризованы правовые основы, определены формы, особенности, раскрыта эволюция становления и развития сословной опеки над сиротами на территории Беларуси в 1772–1861 гг. Впервые в отечественной историографии раскрыта роль дворянских опек и сиротских судов как сословных институтов опеки над дворянством и городскими обывателями, выявлены и охарактеризованы этапы становления и развития опеки над сиротами в сословии духовенства, определены формы опеки над сиротами сельских обывателей, отмечены ее особенности в Виленской, Витебской, Гродненской, Могилёвской и Минской губерниях в рамках Российской империи.

***Рекомендации по использованию.*** Материалы исследования могут быть использованы при написании научных работ по истории Беларуси, создании музейных экспозиций, посвященных воспитанию, образованию и благотворительной деятельности в Беларуси, а также в учебном процессе при преподавании курсов по истории Беларуси, специализированных курсов по социальной истории (в том числе истории детства) Беларуси и исторической антропологии.

***Область применения.*** Материалы диссертационного исследования могут быть использованы в учебном процессе на социогуманитарных факультетах высших учебных заведений, в музейной сфере.

# SUMMARY

Pyshkalo Katerina

## Estate guardianship of orphans in Belarus (1772–1861)

***Key words:*** guardianship, Belarus, urban dwellers, noble guardianship, nobility, clergy, legal regulation, estates, rural dwellers, orphans, orphan court.

***Objective of the research*** – identification of the legal basis, of forms and characteristics of estate guardianship of orphans in the territory of Belarus in 1772–1861.

***Research methods.*** General scientific (description, analysis, comparison and synthesis, induction and deduction) and special historical (historical-genetic, historical-comparative, historical-typological) methods were used to solve the tasks and achieve the research goal.

***Obtained results and their scientific novelty.*** The legal framework is characterized, forms, characteristics are determined, evolution of the formation and development of estate guardianship over orphans in the territory of Belarus in 1772–1861 are revealed. For the first time in Belarusian historiography, the role of noble guardianships and orphan courts as estate institutions of guardianship over the nobility and urban dwellers is revealed, stages of the formation and development of guardianship over orphans in the clergy are identified and characterized, forms of guardianship over orphans of rural dwellers are defined, characteristics of this activity in the Vilnius, Vitebsk, Grodno, Mogilev and Minsk governorates are noted.

***Recommendations for usage.*** The research materials can be used in writing scientific papers on the history of Belarus, creating museum exhibitions dedicated to upbringing, education and charitable activities in Belarus, as well as in the educational process when teaching courses on the history of Belarus, specialized courses on the social history (including the history of childhood) of Belarus and historical anthropology.

***The sphere of usage.*** The materials of the dissertation research can be used in the educational process at the social and humanitarian faculties of higher educational institutions, in the museum field.

Отпечатано в РУП "Издательский дом "Белорусская наука"
Заказ №22. Тираж 60 экз.